ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ

# Напярэдадні вызвалення: красавік

**Супраць партызанскіх брыгад, што дыслацыраваліся на тэрыторыі Любанскага і суседніх раёнаў, нямецка-фашысцкае камандаванне накіравала 13 мотадывізію СС, якая рухалася на фронт, 83 пяхотны полк 102-й пяхотнай дывізіі, 510 батальён добраахвотніцкай арміі, паліцыю (два батальёны і з мясцовых гарнізонаў).**

Агульная колькасць варожай групоўкі складала амаль 20 тысяч чалавек. Іх дзеянні падтрымлівалі да шасцідзесяці артылерыйскіх гармат, батарэя шасціствольных мінамётаў, да сарака іншых мінамётаў, каля дваццаці танкаў і бронемашын.

Так пачалася блакада Любанска-Акцябрскай партызанскай зоны – вайсковая аперацыя супраць партызан і мясцовага насельніцтва з мэтай разгрому партызанскіх фарміраванняў, захопу жывёлы і прадуктаў харчавання, вывазу мірных грамадзян на прымусовыя работы ў Германію.

**Асаблівасцю красавіцкай аперацыі было тое, што вораг імкнуўся вымусіць партызан сканцэнтраваць свае сілы ў адным напрамку, а затым акружыць іх і разбіць.**

Штаб партызанскага злучэння накіраваў камандзірам партызанскіх брыгад загад узмацніць дзейнасць контрразведкі і разведкі ў варожых гарнізонах; стварыць знішчальныя групы для барацьбы з танкамі і бронетэхнікай, узброіць іх гранатамі і толам; пры наступленні праціўніка ні ў якім разе не адступаць цэлай брыгадай да балота або ракі, а выходзіць у фланг або ў тыл варожых войск. Толькі прымяненне смелых манёўраў як метада барацьбы магло даць магчымасць партызанам адбіць атакі варожых войскаў. Адначасова ставілася задача падрыхтаваць мірнае насельніцтва да адыходу ў лясы і балоты, схаваць на астравах на балотах параненых партызан, замаскіраваць харчовыя базы і маёмасць партызанскіх атрадаў.

6 красавіка 1944 г. стала вядома, што праціўнік сілай 120 чалавек з адной артылерыйскай гарматай, адным батальённым мінамётам, двума ротнымі мінамётамі, адным станкавым кулямётам і пяццю-шасцю ручнымі кулямётамі заняў пасёлак Сосны (цэнтр саўгаса «10 год БССР») і размясціўся ў трох дамах. Партызанская разведка далажыла, што вакол пасёлка выстаўлена шэсць пастоў: каля пеньказавода, бальніцы і казармы, па дарозе на Багуслаўку, на мосце за кіламетр ад саўгаса па дарозе на Сялец, на грэблі каля свінарніка на ўсход ад пасёлка.

Атрымаўшы разведдадзеныя, камандаванне партызанскай брыгады №25 імя П. Панамарэнкі прыняло рашэнне разграміць ворага двайным ударам: з боку в. Сялец і з боку в. Камуны. Для выканання задачы былі прыцягнуты ўсе атрады брыгады (акрамя атрада пад камандаваннем Сцяпана Карнеева) агульнай колькасцю да трохсот чалавек. Ударную групу складалі атрады імя Я. Гарбачова і імя А. Неўскага, асноўную групу – атрады імя К. Каліноўскага і «Камсамолец». Атрад імя М. Кутузава прыкрываў атрады з боку в. Кузьмічы, а атрад імя М. Сільніцкага – атрады з боку в. Сялец.

Штаб брыгады знаходзіўся пры ўдарнай групе. У загадзе №77 ад 10.04.1944 г. былі агавораны ўсе акалічнасці аперацыі: колер ракет перад пачаткам наступлення, у выпадку неабходнасці спынення агню і адступлення; паролі (пропуск – «6», водгук – «2»), умоўны знак пры гэтым (у першага вінтоўка ўзнята гарызантальна над галавой, у другога – вертыкальна з боку правай рукі).

Аперацыя была распачата ў ноч з 10 на 11 красавіка. На досвітку ў 4 гадзіны атрады пачалі штурм пасёлка. Вораг адкрыў агонь па партызанах, атрады вымушаны былі спыніць наступленне. Бой працягваўся дзве гадзіны. З-за недахопу боепрыпасаў партызаны адступілі і адышлі на сваю базу.



**Андрэй Сямёнавіч ШАШУРА.**



**Фёдар Міхайлавіч АНІСІМАЎ.**



**Аляксандр Савельевіч АЛЕШКА.**



**Аляксандр Макаравіч ТАРАСЕНКА.**



**Іван Дзмітрыевіч МІГУН.**



**Андрэй Кузьміч ШУМЧЭНЯ.**



**Уладзімір Апанасавіч КАПКО.**



**Мікалай Кузьміч СЦЕКЛЯНЁЎ.**

Брыгада №64 імя В.П. Чкалава ў гэты час вяла жорсткія баі ў раёне загальскіх балот. Выконваючы абавязкі камандзіра брыгады Уладзімір Варатнікоў у сваім данясенні паведамляў:

«…8 красавіка атрадам імя Лазо пры наступленні праціўніка зроблены 3 засады ў раёне Азлом–Баравіно;

9 красавіка брыгада вяла бой на паўночны ўсход ад хутара Похіль;

10 красавіка ў 1.30 брыгада вяла бой на канале Цафман–Калінаўка на пераправе;

11 красавіка сумесна з брыгадай Шашуры (**№161 імя Р. Катоўскага. – Заўв. аўт.**) вялі бой у раёне Горнае – Сосны, за дзень адбіта 4 атакі праціўніка, узяты трафеі – 2 ручныя кулямёты, 8 аўтаматаў, 7 пісталетаў, 2 біноклі і інш. Вызвалена 250 чалавек мірнага насельніцтва;

**12 красавіка брыгада знаходзілася ў акружэнні і сумесна з брыгадай Шашуры вяла баі: разграмілі нямецкі гарнізон вострава Скаварады і знішчылі варожую заставу ў раёне вострава Зыслаў;**

13-14 красавіка брыгада вяла баі на Слаўкавіцка-Ямінскім канале каля хутара Стрычын…»

Байцы брыгады ў гэтых баях паказалі прыклады мужнасці і гераізму. У дакладзе ЦК ЛКСМБ сакратар Мінскага падпольнага абкама ЛКСМБ Пётр Папоў расказаў пра Аляксея Чорнага – памочніка камісара атрада імя М. Громава, які ў час баёў камандаваў часткай атрада. Дзякуючы яго рашучым дзеянням атрад забяспечыў выхад калоне, у якой, акрамя партызан, знаходзілася і мірнае насельніцтва. У гэтым жа дакладзе ўтрымліваюцца звесткі пра адважнага снайпера Саўчанку, які, будучы цяжка параненым, каб не трапіць у палон да ворага, узарваў сябе гранатай.

А 12 красавіка загінуў **Андрэй Шашура** – са студзеня 1943 г. камандзір партызанскай брыгады №161 імя Р. Катоўскага.

Пра апошні бой камбрыга расказаў Барыс Багдановіч – былы начальнік штаба атрада імя В. Молатава: «…на атрады брыгады партызанскім камандаваннем была ўскладзена задача па прарыве з акружэння. У самым пачатку атакі камбрыг быў цяжка паранены ў нагу. Некалькі дзён, па грудзі ў балотнай багне, на насілках з лазы партызаны неслі свайго камандзіра. Не было больш сіл знаходзіцца ў вадзе, і мы выйшлі на невялікі астравок. Тут нас заўважылі самалёты. Немцы абрушылі шквальны артагонь, зверху «рамы» палівалі з кулямётаў. Затым пяхота акружыла востраў. Заняўшы абарону, мы стрымлівалі націск ворага. Шашура кіраваў боем. Хутка яго паранілі яшчэ раз. Штурмаваць наш востраў зноў немцы не адважыліся і адышлі. Несці параненага камбрыга па балоце не было сілы, ды і нельга было яму рухацца – ён моцна аслаб ад страты крыві. Разумеючы гэта, ён загадаў пакінуць яго. Партызаны замаскіравалі насілкі ў кустах алешніку. Праз некаторы час мы пачулі стрэл – камбрыг апошні раз націснуў курок свайго «маўзера»…».

**Андрэй Шашура пахаваны ў мемарыяльным скверы горада Любані.**

Пры выхадзе з блакаднага кальца загінулі многія байцы брыгады №161 імя Р. Катоўскага: Дзмітрый Паспелаў – брыгадны ўрач, **Фёдар Анісімаў** – камандзір партызанскага атрада імя Ф. Дзяржынскага, **Аляксандр Алешка** – камісар партызанскага атрада імя В. Молатава, радавыя байцы Васіль Бяленка, Ілья Барысенка, Якаў Зубарэвіч, Ігнат Горбель, Іван Кірыленка, Дзям'ян Ляшчук і іншыя.

У красавіцкіх баях партызанскія атрады панеслі значныя страты – загінула больш за 70 байцоў. 4 красавіка ў пачатку варожай блакады загінулі **Аляксандр Тарасенка** – начальнік разведкі партызанскага атрада імя Л. Даватара брыгады №64 імя В. Чкалава і **Іван Мігун** – радавы баец партызанскай брыгады №121 імя А. Брагіна. У час бою каля вёскі Асавец пры аказанні параненым медыцынскай дапамогі загінуў фельчар **Андрэй Шумчэня**. 15 красавіка загінуў **Уладзімір Капко** – былы настаўнік Загальскай школы, камандзір аддзялення партызанскага атрада імя Р. Катоўскага брыгады №64 імя В. Чкалава. У гэты ж дзень каля м. Урэчча загінуў **Мікалай Сцеклянёў** – камандзір партызанскага атрада імя С. Лазо. Удзельнікам партызанскага руху ён стаў з ліпеня 1942 г. Спачатку быў радавым байцом, затым яго назначылі начальнікам штаба партызанскага атрада імя М. Громава, а ў жніўні 1943 ён узначаліў партызанскі атрад імя С. Лазо. Мікалай Сцеклянёў пахаваны на могілках ва Урэччы.

**Наталія СІНЯК,**
**дырэктар Любанскага музея народнай славы.**